

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 17 (209) 1 снежня 1993 года, серада*


## Навіны

### Віншуем!

Калектыў факультэта фізічнай культуры віншуе старшых выкладчыкаў кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры Юрыя Кутфеівіча Рахматава, Сяргея Аляксеевіча Аляксандрава, Станіслава Кузьміча Гарадзіліна з прысваеннем вучоных ступеней кандыдатаў педагагічных навук і жадае ім поспехаў і плённай працы.

### Назначэнні

Леанід МікалаевічКівач, доктар фізіка-матэматычных навук, назначаны прарэктарам універсітэта па навуковай працы. Да гэтага Леанід Мікалаевіч працаваў загадчыкам кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі.

### Імянныя стыпендыяты

На падставе рашэння Вучонай рады універсітэта па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі назначаны імянныя стыпендыі і стыпендыі Вучонай рады універсітэта:

**Імя У. І. Леніна**

Салею Сяргею — студэнту 4 курса гістарычнага факультэта.

Грыню Аляксандру — студэнту 4 курса матэматычнага факультэта.

Максімовічу Вячаславу — студэнту 5 курса фізічнага факультэта.

**Імя Я. Купалы**

Маліноўскай Наталлі — студэнтцы 3 курса факультэта беларускай філалогіі і культуры.

**Імя Я. Карскага**

Курловіч Вользе — студэнтцы 5 курса факультэта беларускай філалогіі і культуры.

**Вучонай рады універсітэта**

Якімовічу Юрыю — студэнту 3 курса факультэта правазнаўства.

Якубелю Генадзю — студэнту 4 курса біялагічнага факультэта.

Загоскінай Вользе — студэнтцы 3 курса факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання.

### Навукова-метадычны семінар

У сакавіку будучага года пройдзе агульнаўніверсітэцкі навукова-метадычны семінар на тэму «Самастойная праца як звяно ў навучальным працэсе і навуковай дзейнасці студэнтаў». Мэта яго — удасканаленне навуковай, вучэбна-метадычнай працы, развіццё творчай актыўнасці выкладчыкаў, аспірантаў і саіскальнікаў і ўкаранення даследаванняў у навучальна-выхаваўчы працэс. Праводзіць семінар вучэбна-метадычны аддзел. Плануецца, што адбудуцца адкрытыя заняткі, выставы, «круглыя сталы».

У рабоце яго могуць удзельнічаць усе жадаючыя, для чаго неабходна падаць да 1 студзеня заяўку і тэзісы свайго даклада. Аб 'ём тэзісаў не павінен перавышаць 4 старонкі машынапіснага тэксту. У іх пажадана адлюстраваць наступныя праблемы: «Самастойная праца студэнтаў у навучальным працэсе і навуковай дзейнасці», «Самастойная праца на практычных занятках і вучэбна-вытворчай практыцы студэнтаў», «Матывы самастойнай працы студэнтаў», «Арганізацыя і гігіенічная асновы самастойнай працы студэнтаў», «Роля бібліятэкі, вучэбных кабінетаў і лабараторый у арганізацыі самастойнай працы студэнтаў».

Для правядзення семінара загадам рэктара створаны аргкамітэт на чале з прарэктарам Я. А. Роўбай. Тэзісы дакладаў будуць выдадзены асобнай кнігай.

Заяўкі на ўдзел у семінары просім дасылаць у вучэбна-метадычны аддзел (п. 404).

**Я. КАНДРАТОВІЧ,**
**метадыст вучэбна-метадычнага аддзела.**

## Наша гордасць



Набліжаецца юбілей таварыша па рабоце, старшага выкладчыка, майстра спорту міжнароднага класа, чэмпіёнкі XVIII Алімпійскіх гульняў у Токіо — Алены Уладзіміраўны Валчэцкай-Цюнянковай.

Славутая гімнастка, цудоўны, любімы калегамі і студэнтамі выкладчык, сябра, мы віншуем Вас з юбілеем, паважаная Алена Уладзіміраўна. Вы — гонар нашага факультэта, універсітэта, рэспублікі і ўсяго неабсяжнага былога Саюза. Дзякуючы Вам пра наш горад ведаюць ва ўсім свеце, Вы далі моцны штуршок наступным алімпійцам Беларусі.

Мы захапляемся Вамі, як у тым далёкім алімпійскім 1964-м. Мы ведаем, што Вы вельмі таленавіты і шчаслівы чалавек. Ад усёй душы прыміце нашы віншаванні з юбілеем. Здароўя, жыццярадаснасці, невычарпальнай веры ў дабро, шчасця Вам на доўгія гады, горача любімая і паважаная Алена Уладзіміраўна!

**Выкладчыкі, студэнты факультэта фізічнай культуры.**

**На здымку: А. У. ВАЛЧЭЦКАЯ.**

## *НА ВУЧОНАЙ РАДЗЕ*

Адбылося чарговае пасяджэнне Вучонай рады універсітэта, на якім былі разгледжаны пытанні: аб практыцы курсавога і дыпломнага праектавання на матэматычным факультэце і факультэце правазнаўства, зацвярджэнне фінансуемых дзяржбюджэтных навуковых даследаванняў, аб забеспячэнні літаратурай курсаў спецыяльных і прафесійных дысцыплін, зацвярджэнне праграмы па беларускай мове для бакалаўраў і абмеркаванне артыкулаў, змешчаных у «Гродзенскай праўдзе» і «Настаўніцкай газеце».

У выступленнях Т. Э. Мождж.эра, дэкана матэматычнага факультэта і І. В. Гушчына, дэкана факультэта правазнаўства, было адзначана, што дыпломнае і курсавое праектаванне — састаўная частка вучэбнага працэса. Аналіз статыстычных даных паказвае, што колькасць выдатных адзнак за дыпломныя працы ў параўнанні з мінулым годам зменшана на 15 працэнтаў. Гэта сведчыць аб тым, што неабходна забяспечыць большую якаснасць праектаў, павысіць патрабаванні да зместу працы. Пры падрыхтоўцы курсавых і дыпломных прац катастрафічна не хапае аўдыторый для правядзення кансультацый, сустрэч студэнтаў з выкладчыкамі, што не дае магчымасці весці пастаянны кантроль за выкананнем працы. Зроблены вывад, што на сённяшні дзень ва універсітэце не склалася сістэма курсавога і дыпломнага праектавання, зацягваецца замацаванне студэнтаў за кафедрамі, спазняецца вызначэнне тэм на 1993-94 навучальны год.

Вучонай радай прапанавана рэкамендаваць да фінансавання 10 навуковых праектаў, на што патрабуецца больш як 240 мільёнаў рублёў.

Пры абмеркаванні пытання аб забеспячэнні літаратурай курсаў спецыяльных і прафесійных дысцыплін В. С. Станкевіч, загадчык бібліятэкі, зазначыў, што 80 працэнтаў студэнтаў атрымліваюць усе неабходныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Цяпер бібліятэка набывае практычна толькі беларускія выданні. Дапамагае выдавецтва універсітэта. Цяжкае становішча склалася на факультэце правазнаўства, на аддзяленні міжнародных эканамічных адносін, студэнтам якога не хапае спецыяльнай літаратуры. Кафедрам неабходна своечасова падаваць заяўкі на недастаючыя падручнікі і дапаможнікі, прапанавана купляць асабліва карысныя выданні па камерцыйных цэнах.

Зацверджана праграма па беларускай мове для бакалаўраў. З 1994 года ва універсітэце па эксперыментальнай праграме выпускнікі змогуць набыць ступень бакалаўра, здаўшы дзяржаўны экзамен па курсу «Сучасная беларуская мова».

Прайшло абмеркаванне артыкулаў, змешчаных у «Гродзенскай праўдзе» і «Настаўніцкай газеце» («Адны будуюць, другія чакаюць»). Была створана камісія па высвятленню справядлівасці абвінавачванняў у адрас кіраўніцтва універсітэта і некаторых выкладчыкаў. Адзначана, што абвінавачванні неабгрунтаваныя, носяць непрыстойны характар, на канкрэтныя пытанні камісія не атрымала ад аўтараў артыкулаў пэўных адказаў.



**Універсітэт рыхтуецца да свайго юбілею. З гэтай нагоды рэдакцыя мяркуе больш падрабязна расказаць аб жыцці і дзейнасці факультэтаў, аддзелаў, іншых служб.**

**Госцем сённяшняга нумара з 'яўляецца кафедра інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі. Згадзіцеся, што будучае нашай вытворчасці і прагрэсу. Наш фотакарэспандэнт Уладзімір Сарокін зрабіў гэты здымак пры абмеркаванні выкладчыкамі кафедры новых перспектыўных накірункаў сваёй работы.**

**Матэрыял пра жыццё і дзейнасць кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі чытайце на**

# МАЯ ВУЧАНІЦА

Праходзяць гады, і сам не заўважаеш, як уступіў у пару сталасці, і падышоў час азірнуцца на перажытае, асэнсаваць яго і паглядзець уперад...

Наступіла такая пара і ў жыцці Марыі Іосіфаўны Канюшкевіч.

Я памятаю Марыю Іосіфаўну студэнткай факультэта пачатковага навучання, семнаццацігадовай дзяўчынкай, якая даймала мяне, ды і ўсіх выкладчыкаў, бесперапыннымі пытаннямі. Гэта была настойлівая «чамучка», дапытлівая, з прагнай цікаўнасцю пранікаючая ў «тайны» рускай мовы, і разам з тым вельмі ініцыятыўная, энергічная студэнтка, любіміца групы, яе канавод і арганізатар многіх цікавых спраў.

Пасля заканчэння факультэта Марыя здзівіла мяне, катэгарычна не прыняўшы прапанову прафесара Гурскага аб паступленні ў аспірантуру па педагагічнай спецыяльнасці, рашуча заявіла, што будзе толькі філолагам, і зараз жа афармілася завочна на філалагічны факультэт. Яна звярнула на сябе ўвагу, бо ў яе выявіліся лінгвістычныя здольнасці, паглыблена займалася даследчай працай, выдатна абараніла дыпломную работу.

Гэта настаўніца рускай мовы з Ліды далёка апярэдзіла сваіх аднагодкаў, бо мела сур'ёзны зачын у навуковай працы.

Яна была запрошана на кафедру рускай мовы, паступіла ў аспірантуру і паспяхова скончыла яе, маючы двух маленькіх дзетак.

Марыя Іосіфаўна была абрана на пасаду загадчыка кафедры рускай мовы. Такі імклівы ўзлёт здзівіў многіх, але не выкладчыкаў кафедры, якія прынялі яе вельмі добразычліва і дапамаглі ўвайсці ў калектыў. Авалодваючы метадамі кіравання кафедрай, Марыя Іосіфаўна многаму вучылася ў сваіх былых настаўнікаў, але і многае давала сама.

Можна гаварыць аб асобым стылі працы М. І. Канюшкевіч, заснаваным перш за ўсё на яе глыбокай эрудыцыі не толькі ў філалогіі і сумежных навуках. Лёгкае валоданне некалькімі мовамі, веданне спецыфікі сучаснай вузаўскай педагогікі, глыбокае пранікненне ў псіхалогію чалавечых адносін дапамаглі правільна арганізаваць вучэбны працэс на кафедры.

Марыя Іосіфаўна ўмее размеркаваць работу па магчымасцях, здольнасцях і інтарэсах кожнага члена кафедры.

У выніку новае дыханне набыў тэарэтычны семінар кафедры, з'явіліся сур'ёзныя даследаванні, падрыхтаваны аспіранты, прыкметна абнавілася ўся работа кафедры, асабліва ў выхаванні студэнтаў. Пасяджэнні кафедры праходзяць цікава, іншы раз заканчваюцца вясёлым чаяваннем. Пры гэтым ніякага панібрацтва. Адлегласць паміж Марыяй Іосіфаўнай і членамі кафедры заўсёды захоўваецца.

Наша «загадчыца» умее выказаць непрадузятыя рэчы, каб не скрыўдзіць і не азлобіць чалавека, вельмі далікатна зазначыць недахопы і памылкі і зараз жа дапамагчы, даць добрую параду. І здзіўляючая патрабавальнасць да сябе, сціпласць, здольнасць да самааналізу. Марыя Іосіфаўна ўмее адвесці ад кафедры незаслужанныя рашэнні па кадравых пытаннях, дамагчыся паляпшэння ўмоў працы.

Новая ступень росту — падрыхтоўка і паспяховая абарона доктарскай дысертацыі ў рэкордна кароткі тэрмін без адрыву ад працы.

І вось Марыя Іосіфаўна — доктар філалагічных навук, прафесар.

Пасада абавязвае, асабліва пасада дэкана факультэта. Узнікае небяспека з'яўлення такіх якасцей, як пачуццё непамылковасці, самаўзнясення, адрыў ад калектыву, чым і бываюць грэшны многія кіраўнікі. Усяго гэтага Марыя Іосіфаўна пазбегла і засталася сціплым чалавекам з павышанай патрабавальнасцю да сябе. Яна ўмее ўважліва выслухаць чалавека, зразумець яго і дапамагчы па меры магчымасці.

Як бы яна не была занята, яна ніколі не забывае аб тых, хто пайшоў на заслужаны адпачынак, сваіх былых настаўнікаў. Я гэта асабліва адчуваю і цаню яе ўважлівыя адносіны да мяне і клопат. Гэта заўсёдная цікавасць аб стане здароўя, аб маральным самаадчуванні. Чуллівыя знакі ўвагі: барвенак, які клапатліва вырасціла Марыя Іосіфаўна на магілцы майго мужа, таксама яе былога настаўніка, першыя падснежнікі, ландышы, першая сунічка, клубніка і іншыя дары прыроды. Кветкі, кветкі, шмат кветак... Яна быццам падказвае, што і ў старасці ёсць паэзія. Як гэта прыгожа! Пастаянныя наведванні, званкі. Асабліва дарагія для мяне яе «пасланні», у якіх бляск дасціпнасці і скрытая пяшчотнасць.

Яна клапацілася аб Міхаілу Аляксадравічу Корчыцу да апошняга яго ўздыху, імкнучыся аблягчыць яго пакуты і аказаць пасільную дапамогу. Аказвае ўвагу Сямёну Аляксандравічу Грыгор'еву, ствараючы найбольш спрыяльныя ўмовы для работы.

Калі ў Марыі Іосіфаўны пытаюцца, чаму яна пакінула пасаду дэкана факультэта, яна шчыра адказвае: «Гэта не маё месца. Я вярнулася на работу, якую люблю, і зараз у мяне душэўны камфорт. Я адчуваю сябе шчаслівай».

Як гэта добра, калі чалавек выбірае сваё месца па інтарэсах і магчымасцях. Можна сказаць, што Марыя Іосіфаўна не «тыпічная» дзелавая жанчына. Гэта яркая асоба, разнастайна адукаваная, глыбока інтэлігентная, эмацыянальная, жаноцкая. Уражвае яе невычарпальная энергія, феерверк трапных знаходак, адкрыццяў, экспромтаў. Дзівосная знаходлівасць пры рашэнні раптоўна ўзнікшых праблем і цяжкасцей, уменне знайсці выхад з любога, здавалася б, бязвыхаднага становішча.

Аснову маральнасці асобы Марыі Іосіфаўны складае бескампрамісная сумленнасць. Яна не зносіць фальшы, бясстрашна ўступае ў барацьбу з любым праяўленнем непрыстойнасці. За гады работы ва універсітэце яна ні разу не пакрывіла душой, захоўваючы прынцыповасць і вернасць доўгу ў вялікім і малым. Мэтанакіраванасць і велізарная працаздольнасць пранізвае ўсе бакі яе дзейнасці. Энергія і дабрыня яе невычэрпныя. І гэта важны паказчык далейшага росту і творчых поспехаў.

Марыю Іосіфаўну любяць і глыбока паважаюць на факультэце і ва універсітэце. Яна вядома ў горадзе і вобласці як цудоўны лектар і таленавіты педагог і карыстаецца любоўю і павагай сярод педагагічнай грамадскасці. Яе ведаюць у рэспубліцы і далёка за яе межамі.

Мы ганарымся сваёй выхаванкай і радуемся яе поспехам. 50 гадоў — не старасць. Гэта творчая сталасць і новыя крокі ўперад і вышэй.

Шчасця табе, любімая Марыя, здароўя, радасці, поспехаў. Няхай твой душэўны камфорт працягнецца доўга-доўга. Глыбокая ўдзячнасць і сардэчнае прывітанне твайму надзейнаму сябру і памочніку, тваёй надзейнай апоры жыцця — дарагому мужу Міхаілу Сяргеевічу, які дапамог табе быць такой, якая ты ёсць. Сардэчна віншуем з другім святам — шчаслівым трыццацігадовым шлюбам. Шчасця дзецям і ўнукам.

**Е. ЛАЎРЫНАЙЦІС,**
**былы дэкан філалагічнага факультэта, ганаровы член кафедры рускай мовы.**



## Марыі Іосіфаўне Канюшкевіч — вучонаму, калегу, маці, бабулі — чалавеку

К шаноўнай і паважанай
З замілаваннем і пашанай
Гэтым днём адмысловым
Звяртаемся са Словам.

Прыгожаму чалавеку—
Прыгожая дата...
За нейкіх паўвека—
Да доктара ад кандыдата!

Слаўны поспех і чынны
Няўрымслівай жанчыны.
Гаворым пра гэта без соладзі,
Вы — гэта ўзор для моладзі:
Пенкная і слічная,
Таленавітая, энергічная,

Дый гаспадыня слаўная—
На ўсе рукі спраўная.

Шчыра дзяцей атульвае,
Стаўшы ўжо бабуляю,
Марку сваю трымае.

А які яна голас мае:
Самы сапранна-спеўны,
Чароўны і задушэўны.

І ў навуцы голас
Важкі, як выспелы колас.
Верым: яго зярняты—
Будучыя кандыдаты.

Хай будзе ніва зладжаная
Вашай рукой пасаджаная.

Шчасця, радасці, дабра
І плёну творчага пяра.

**Т. ТАМАШЭВІЧ.**

## Хор закаханых мужчын філфака

Не думай о Марии свысока.
Наступит время,
сам поймешь, естественно,
Что женщина, чья поступь так легка
Божественна, божественна,
божественна.

И влюбишься в нее,
и пропадешь,
Впадешь в отчаянье в любую мистику,
Поскольку у нее в душе найдешь
Лингвистику, лингвистику,
лингвистику.

Лингвистика в душе ее царит,
Науку нам не потеснить в сознании,
И пусть влюблённый тихо затаит
Рыдания, рыдания, рыдания.

Лингвистика оттачивает мысль,
Глаголы добавляют обаяния,
Ах, если б всё могли предвидеть мы
Заранее, заранее, заранее.

Идет Мария, ласково глядит,
Плывёт, как лебедь, как корабль под парусом,
Поклонника улыбкой наградит,
Улыбкою прекрасной, но безжалостной.

Взмолиться бы: Мария, снизойди,
Оставь частицы, посмотри на целое,
Но рвется лишь дыханье из груди
Несмелое, несмелое, несмелое.

**А. ФЕДУТА.**

Как махнешь ты своей правой рученькой,
В белый свет летят диссертации,
Как махнешь ты своей левой рученькой,
Так в журнале идут публикации.
Гой, премудрая дай величавая,
Ты прими от нас песнь величальную,
Величальную песнь дай Боянов стих
От студентов прими, от коллег своих.
Мы тебе славу поем, славу поем
Славу многую.
Как нахмуришь чело своё ясное
Над студентами гром и молнии,
Льешь из червленых уст реки мудрости
Словно сахарной кормишь естовушкой.
Не Парисов суд с богами,
Не гигантов брань пою,
Я почтенному коллеге
Честь и славу воздаю.

За труды твоя понеже
Над российским языком
Я тебя высоким штилем
Паче меры вспеть готов.
Димперацией студентов
Прям в конфузию введен,
Я тебе за всем решпектом
Свой нижайший шлю поклон.
Я желаю, чтоб Венерой
У коллег ты прослыла,
Чтобы новою Палладой
Ты в словесности была,
Чтобы милостью Фортуны
Всем смогла доказать:
Ломоносовых способна
Ваша кафедра рождать.
Я помню чудное мгновенье:
Открылась дверь, звенит звонок.
Твое напомнило виденье,
Что я не выучил урок.
С тоской свой взгляд в тебя вперяю,
Вложив заветные мечты:
Чтоб стал на миг твой облик нежным,
Смягчив профессора черты.
Звенит звонок, тоска уходит
И мне мила, как прежде, ты.
Уходить?!—Чудное виденье!?
Надолго!?—Ангел красоты!!!

Иных уж нет, а я далече,
Как Сади некогда сказал,
И адрес мой до новой встречи—
Россия, чемодан, вокзал.
Но вёрст чугун превозмогая,
Я к вам по-прежнему стремлюсь,
И уж никак не позже мая
Над ручкой вашею склонюсь.

**И. ЕГОРОВ.**

* * *

Гой еси ты свет, Мариюшка,
А по батюшке — свет Иосифовна,
гой профессор языка святорусского,
Святорусского дай великого.

## Якім будзе новы пашпарт?

Савецкага Саюза ўжо няма, а мы дагэтуль карыстаемся пашпартамі былога СССР. Таму ў нашай рэспубліцы пачата работа па пашпартызацыі насельніцтва Беларусі. Саветам Міністраў зацверджана палажэнне аб новым пашпарце.

Паводле звестак БелаПАН, новы пашпарт грамадзяніна Беларусі універсальны, паколькі будзе дзейнічаць і на перыяд паездкі за межы рэспублікі, і машыначытальны — гэта значыць, яго даныя можна счытваць з дапамогай камп'ютара. Плануецца ўвядзенне рэгістра — своеасаблівага кода грамадзяніна ў выглядзе адзінаццацізначнай лічбы. Нацыянальнасць у пашпарце не пазначаецца. Тэкставае афармленне будзе рабіцца на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай. Прапіска, па-сутнасці, не адмяняецца, аднак цяпер яна ўжо будзе называцца «указанне месца жыхарства». Выдавацца новыя пашпарты грамадзян Беларусі будуць асобам, якія маюць права на грамадзянства рэспублікі, пры дасягненні імі ўзросту 16 гадоў, а ў 25- і 45-гадовым узростах плануецца мяняць іх на новыя.

Плануецца, што пашпарты грамадзян Беларусі новага ўзору будуць выдавацца ўжо ў першай палове наступнага года. І першымі іх атрымаюць жыхары Мінска. Усяго ж на пашпартызацыю насельніцтва Беларусі, на думку спецыялістаў, спатрэбіцца не менш як два гады.

## Ісаакіеўскі сабор у... Гродне

Копія небезвядомага Ісаакіеўскага сабора, што ў Санкт-Пецярбурзе, праўда, у меншым памеры, хутка з'явіцца ў Гродне. Так будзе выглядаць будынак часоўні, будаўніцтва якой пачата побач з кафедральным Свята-Пакроўскім саборам па вуліцы Э. Ажэшкі. Прызначана яна для хрышчэння нованароджаных і атрымае назву немаўляці Гаўрыіла Беластоцкага.

Будоўля стала пацвярджэннем думкі, што духоўнасць народа незнішчальная. Работы вядуцца ўсім светам. Спецыялісты інстытута «Гроднаграмадзянпраект» бязвыплатна зрабілі чарцяжы будынка, прадпрымальнікі бясплатна дапамаглі матэрыяламі, прыхаджане сабралі грошы. Узначалілі работы — таксама бескарысна — інжынеры-будаўнікі з ліку пенсіянераў.

**Б. ЯКАЎЛЕЎ.**

## З жыцця кафедры

# Неабходная прафесія

Камп ´ютар прыцягвае ўсіх. А дзятва ад яго таінстваў проста ў захапленні. Каму не хочацца дабрацца да сакрэтаў лічб, малюнкаў, ліній! У школах зараз урокі інфарматыкі самыя любімыя і паважаныя.

Па-свойму зайздросцяць і тым, хто вывучае камп ´ютарныя сістэмы, праграміраванне ў нашым універсітэце.

Гэтыя здымкі зроблены на інжынерна-матэматычным аддзяленні матэматычнага факультэта. Пракаменціраваць ход вучобы студэнтаў мы папрасілі загадчыка кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі прафесара **А. Д. БУРЫКАВА.**



— Навучальны працэс на інжынерна-матэматычным аддзяленні забяспечваюць дзве кафедры — інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі і прыкладной матэматыкі. Рыхтуем спецыялістаў па спецыяльнасці «Праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм». Той, хто заканчвае універсітэт, атрымлівае кваліфікацыю «Інжынер-матэматык-праграміст». Падрыхтоўка вядзецца па адной спецыялізацыі матэматычнага або праграмнага забеспячэння сістэм аўтаматызацыі і аўтаматызаваных вытворчасцей. У рамках гэтай спецыялізацыі ёсць 6 накірункаў паглыбленай падрыхтоўкі.

Асаблівасцю падрыхтоўкі спецыялістаў па цяперашняму вучэбнаму плану з´яўляецца набыццё інтэгральнай кваліфікацыі, якая вельмі неабходна зараз на малых прадпрыемствах, дзе няма магчымасці браць сукупнасць вузкіх спецыялістаў — «Інжынер-матэматык», «Інжынер-эканаміст». Паколькі галін народнай гаспадаркі шмат і весці для кожнай з іх падрыхтоўку спецыялістаў складана, таму выбраныя накірункі ў асноўным нацэлены на машына- і радыёбудаванне. Яны базавыя для ўсіх іншых асноўных галін.

Вучэбны план складзены такім чынам, каб забяспечыць інтэгральную падрыхтоўку. Ён складаецца з шэрагу блокаў, такіх як грамадска-палітычныя і гуманітарныя дысцыпліны; дысцыпліны па класічнай матэматыцы; інжынерна-фізічныя і эканамічныя дысцыпліны і інфарматыка і вылічальная тэхніка. Такая структура дазваляе без сур ´ёзнай дапрацоўкі перайсці на шматузроўневую падрыхтоўку спецыялістаў. Гэта азначае, што на першым этапе — праз 2 гады — даецца сярэдняя прафесійная кваліфікацыя, на другім — 4 гады — вышэйшая прафесійная і, нарэшце — спецыяльная адукацыя. Студэнты праходзяць некалькі вытворчых і эканоміка-вытворчых практык, у асноўным на МП і буйных прадпрыемствах Гродна і Беларусі.

У час сваёй першай практыкі студэнты ўжо гатовы прымяняць сродкі вылічальнай тэхнікі і апарацыйныя сістэмы, алгарытмічныя мовы праграміравання (Асемблер, Турба-Паскаль і інш.). Умеюць таксама канструяваць праграмнае забеспячэнне. На другім узроўні падрыхтоўкі адпрацоўваюцца задачы выбару і распрацоўкі матэматычных мадэляў алгарытмаў і ўскладнёнага праграмнага забеспячэння. На трэцім узроўні студэнты выбіраюць той ці іншы накірунак спецыялізацыі і вядуць паглыбленую падрыхтоўку, пасля чаго могуць рыхтаваць дысертацыю. Пасля першага ўзроўню падрыхтоўкі будзе давацца ступень бакалаўра, пасля другога — магістра, пасля трэцяга — доктара.

Гэта ў перспектыве, і мы гатовы перайсці на такую форму навучання. Выкарыстоўваем лепшы вопыт ВНУ Беларусі, Расіі, іншых краін.

Нашы кафедры ўкамплектаваны высокакваліфікаванымі выкладчыкамі, сярод якіх ёсць прафесар, дацэнты. Толькі ў бягучым годзе атрымалі званне дацэнта Т. М. Ізосімава, Н. П. Макарава. Для чыткі асноўных курсаў і спецкурсаў, звязаных з інжынернай дзейнасцю, запрашаем спецыялістаў з прадпрыемстваў Гродна — упраўлення «Мантажаўтаматыка», ВА «Хваля», МП «Алгарытм» і інш.

Для вучобы студэнтаў ва універсітэце створаны належныя ўмовы — ёсць дысплейныя класы, графапабудоўшчыкі, сеткі ЭВМ і іншае абсталяванне. Характэрнай асаблівасцю нашага аддзялення з´яўляецца тое, што пасля трэцяга курса нашых студэнтаў запрашаюць працаваць па спецыяльнасці на прадпрыемствы, як, напрыклад, Віктара Драгуна, Андрэя Санько і інш.

Нашы выпускнікі добра працуюць на прадпрыемствах і ў арганізацыях горада. На ВЦ універсітэта станоўча зарэкамендавалі сябе Салдатаў, Аўсейчык, Васілюк, Драгун. Г. Патаніна працуе вядучым інжынерам ва ўпраўленні «Мантажаўтаматыка», К. Іванішэўскі — на ВА «Хваля».

**На здымку: Ідзе пасяджэнне кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі.**

**Фота У. САРОКІНА.**

# ШТО ЧЫТАЕ СТУДЭНТ

**Бібліятэка правяла анкетаванне студэнтаў па пытанню «Што чытае моладзь?»**

**У анкетаванні прынялі ўдзел студэнты 2—5 курсаў матфака, гістфака, факультэта правазнаўства, часткова філфака, ва ўзросце:**

**— 18—20 гадоў — 65 чалавек,**

**— 21—23 года — 35 чалавек.**

У анкеце былі наступныя пытанні, на якія атрыманы адказы:

**1. Дзе Вы жывеце?**

— У абласным і раённым цэнтры — 63%.

— У сельскай мясцовасці — 37%.

**2. Ваша родная мова:**

— беларуская — 58%,

— руская — 37%,

— усё роўна — 5%.

**3. Якой мове пры чытанні кніг Вы аддаеце перавагу?**

— беларускай — 6%,

— рускай — 72%,

— усё роўна — 22%.

**4. Як Вы лічыце, ці дастаткова выдаецца ў Беларусі кніг для моладзі?**

| | на руск. мове | на бел. мове |
|---|---|---|
| — дастаткова | 26% | 18% |
| — недастаткова | 29% | 46% |
| — не ведаю | 46% | 36% |

**На погляд студэнтаў, не хапае кніг:** па гісторыі, гісторыі роднага края, філасофіі, кніг замежных аўтараў на беларускай мове, вучэбнай літаратуры па беларускай мове і літаратуры, навуковай літаратуры, кніг пра моладзь, аб культуры, сучаснай літаратуры, фантастыкі.

**5. Якія кнігі беларускіх аўтараў Вы прачыталі ў апошні час?**

— У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха», «Каласы пад сярпом тваім», С. Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча», а таксама кнігі А. Макаёнка, І. Мележа, І. Шамякіна, А. Адамовіча, Л. Дайнекі, В. Быкава і інш.

**6. Якія кнігі Вы хацелі б набыць?**

— Арлоў У. «Міласць князя Гераніма» — 19%,

— Бярроуз Э. «Тарзан» — 24%,

— Буссенар Л. «Похитители бриллиантов» — 22%,

— Купер Ф. «Лоцман» — 22%,

— Рубан І. «Дзяўчына з начной каверні» — 24%.

**7. Як Вы выкарыстоўваеце свой вольны час?**

— чытаю кнігі — 48%,

— гляджу тэлеперадачы — 42%,

— хаджу ў кіно, тэатры — 39%,

— слухаю музычныя запісы — 31%,

— займаюся спортам — 19%,

— праводжу час на двары з сябрамі — 15%,

— працую — 12%,

— наведваю дыскатэкі, кафэ — 9%,

— займаюся рукадзеллем — 8%.

**8. Колькі кніг Вы прачытваеце ў месяц?**

1—2—51%,

3—5—35%,

звыш 5 кніг — 14%,

**Аб цікавых кнігах студэнты даведваюцца з наступных крыніц:**

— ад бацькоў — 19%,

— ад выкладчыкаў —21%,

— ад сяброў — 42%,

— ад бібліятэкараў — 9%,

— самастойна выбіраю ў бібліятэцы — 14%,

— з газет і часопісаў — 11%,

— ад работнікаў кнігарні — 8%.

**9. Дзе Вы набываеце кнігі для чытання?**

— У хатняй бібліятэцы — 41%,

— у бібліятэцы — 34%,

— у знаёмых, сяброў, родных — 41%,

— у кнігарнях — 37%.

**10. Як часта Вы наведваеце кнігарні?**

— раз у месяц — 50%,

— амаль кожны дзень — 38%,

— 1—2 разы ў год — 10%.

**11. Назавіце апошнюю кнігу, якую Вы набылі.**

Студэнты набылі наступныя кнігі: «Анталогия ужасов», кнігі С. Ясеніна, М. Лермантава, Ж. Верна, А. Дзюма, А. Крысці, Э. Сю, В. Пікуля, «Грамадзянскі працэс», Боннар А. «Греческая цивилизация», «Вязание» і іншыя.

12. На пытанне, **якія кнігі Вы любіце чытаць,** атрыманы наступныя адказы:

— раманы, аповесці і апавяданні рускіх класікаў — 24%,

— раманы, аповесці і апавяданні беларускіх пісьменнікаў — 10%,

— раманы, аповесці і апавяданні замежных пісьменнікаў — 42%,

— прыгоды і фантастыку — 45%,

— дэтэктывы — 43%,

— навуковую і навукова-папулярную літаратуру — 21%.

**Менш усяго студэнтаў цікавяць паэзія, спорт, кнігі аб падарожжах.**

**Студэнты звяртаюцца да кніг па наступных матывах:**

— ёсць жаданне чытаць — 50%,

— для выканання вучэбнай праграмы — 17%,

— для павышэння кругагляду — 39%.

У цяперашні момант студэнты чытаюць наступныя кнігі: Д. Карнегі «Как завоевывать друзей», Дж. Стэйнбека «Зима тревоги нашей», В. Шэкспіра «Гамлет», В. Аўчыннікава «Ветка сакуры», «Микро ЭВМ», Мітчэл М. «Унесенные ветром», «Очерки истории Китая», А. Дзюма «Граф Монте-Кристо».

Студэнты таксама хацелі б прачытаць наступныя кнігі, але не заўсёды могуць іх знайсці: Е. А. Лявіцын «Занимательная радиотехника», Нязнанскіх «Ярмарка в Сокольниках», В. Пікуль «Три возраста Окини-Сан», кнігі аб Радзівілах, Г. Сянкевіча, А. Дзюма «10 лет спустя», «Крымінальнае права».

13. На пытанне, **што трэба зрабіць, каб кнігі, якія Вас цікавяць, заўсёды можна было знайсці, атрыманы адказы:** выпускаць не кааператыўныя кнігі, а дзяржаўныя, расшырыць колькасць кніжных магазінаў, выпускаць патрэбныя кнігі ў дастатковай колькасці, лепш камплектаваць бібліятэкі, зацікавіць бібліятэкараў сваёй работай, выпускаць кнігі па даступных цэнах, вывучаць чытацкі попыт, менш друкаваць макулатуры.

**14. Ці чытаеце Вы газеты, якія выходзяць у рэспубліцы?**

— «Звязда» — 10%,

— «Народная газета» — 17%,

— «Советская Белоруссия» — 16%,

— «Гродненская правда» — 37%,

— «Знамя юности» — 19%,

— Районная — 9%,

— «7 дней» — 10%

**Студэнты рэгулярна чытаюць наступныя часопісы:** «Родник», («Крыніца»), «Парус», «На экранах Беларусі», «Я+Я», «Салон», «Вожык».

**У газетах і часопісах студэнтаў цікавяць тэмы:** палітыка, гісторыя, эканоміка, аб моладзі, пра Чарнобыль, спорт, крымінальныя падзеі, інтэрв ´ю з цікавымі людзьмі, культура, сучаснасць, дамаводства.

— 50% студэнтаў рэгулярна карыстаюцца бібліятэкай,

— ад выпадка да выпадку — 28%,

— не карыстаюцца — 10%.

**Пры наведванні бібліятэкі студэнты:**

— усё, што трэба, атрымліваюць — 33%,

— іншы раз не — 34%,

— не заўсёды атрымліваюць — 27%,

— не магу адказаць — 6%.

**15. Якія кнігі Вы ўзялі ў бібліятэцы ў час апошняга наведвання?**

— кнігі па матэматыцы, філасофіі, алгебры, літаратуразнаўству, гісторыі, правазнаўчых дысцыплінах, гісторыі Польшчы, Украіны, СССР, Сірыі, навуковую літаратуру па Грэцыі, Рыму, крымінальнаму працэсу, А. Дзюма «10 лет спустя», А. Міцкевіча «Поэмы», В. Аўчыннікава «Корни дуба».

Аднак студэнты атрымалі адказ на літаратуру: «История русской философии», «Н. О. Лоскі», «Р.-П. Уорэн «Вся королевская рать», Т. І. Трафімава «Курс физики», А. Ф. Філіпаў «Сборник задач по дифуравнениям», УПК БССР, «Трудовое право».

На пытанне, **ці задаволены вы ў цэлым бібліятэчным абслугоўваннем, атрыманы такія адказы:**

— цалкам — 37%,

— часткова — 42%,

— не задаволены — 2%,

— не магу адказаць — 19%.

**Г. МІНІЧАВА,**
**супрацоўнік бібліятэкі.**

# Дні матфака

7—10 снежня запрашаем на Дні матэматычнага факультэта-93. Матэматычны факультэт прапануе цікавую праграму:

**7 снежня — адкрыццё Дзён матфака-93:**

И старики, и молодёжь
селенье бросили,
Спешат в луга, волненьем
радостным объяты.

**Уильям Соммервил**

**прывітанне дэкана факультэта:**

О, говори, отец любимый,
Твои слова — как вешний
ветерок.

**Милмен**

**прывітанне выкладчыкаў:**

Похвально то, что ты науки
почитаешь,
Похвальнее еще, что ты
сам
сочиняешь...

**А. А. Ржевский**

**канцэрт студэнтаў:**

Вокруг него топтались любопытные детишки, смотрели и слушали, раскрывали рты,— это им никогда не надоедало.

**Стругацкие**

**аўкцыён:**

Почём опиум для народа,
батюшка?

**Ильф и Петров**

**дыскатэка.**

**8 снежня — прэс-канферэнцыя выкладчыкаў:**

Это моё высказывание доказывает лишь, что и я могу быть также глуп, как и любой другой.

**А. Азимов**

**КВЗ: студэнты і выкладчыкі:**

— Не ушиб ли я вас во время последней встречи?

— Нет, отчего же, очень приятно было встретиться.

**Ильф и Петров**

**дыскатэка.**

**9 снежня — канцэрт студэнцкага фальклору. Выступленні гасцей.**

**10 снежня — закрыццё Дзён матэматычнага факультэта: заключны канцэрт студэнтаў, выкладчыкаў і гасцей з праграмай камерунскіх народных танцаў.**

Счастливый день!
Счастливый час!
Ты не обман мечты пустой—
Ты мне сиял, но ты погас,
Мираж златой.

**Э. По**

На працягу Дзён матфака Вы зможаце наведаць музей матэматыкі. Сачыце за рэкламай! Чытайце матэрыялы ў газеце «Гродзенскі універсітэт».

